Зяньковіч М.

# ПЯЦЬ ХВІЛІН ПЕРАД БЯССМЕРЦЕМ

**ХВІЛІНА ПЕРШАЯ**

Усё. Канец...

Выйсця няма...

Ён не хацеў ашукваць сябе надзеяй:

"А раптам?" Ён ведаў – выратавання чакаць няма адкуль. Фашысты замкнулі кальцо.

Ён стаяў адзін сярод трупаў мёртвых ворагаў і трымаў адну-адзіную гранату. Збоку ляжаў непатрэбны цяпер аўтамат – скончыліся патроны. Стаяў і глядзеў, як роўнай шарэнгай, бы на парадзе, ва ўвесь рост, з аўтаматамі на баявым узводзе, рухаліся фашысты. З усіх канцоў: ззаду – з боку Лебядзенкі, спераду – з боку Рудні, справа – з боку Буды, злева – з боку Межанцоў. Было нешта злавеснае ў гэтай затоена-трывожнай маўклівасці ворагаў.

Ён зразумеў, што побач – смерць.

Уся яго натура працівілася гэтай думцы. Ён паглядзеў на яркае ліпеньскае сонца, на лясныя кветкі, рассыпаныя на паляне, – усё прагна дыхала жыццём. І зноў думка аб смерці здалася яму нейкай недарэчнай.

Раз! Раз! Раз-два-тры!

Гэта – яны. Гэта няўмольная смерць. Праз якія пяць хвілін прыйдзе яна да яго, семнаццацігадовага юнака. Каб пераадолець адлегласць, што аддзяляе фашыстаў ад бяззбройнага партызана, ім трэба пяць, толькі пяць хвілін.

Жыць! Як хочацца жыць! Жыць, каб не толькі дыхаць, – каб зноў страляць і страляць.

Пяць хвілін... Ззаду – сямнаццаць гадоў, уперадзе – толькі пяць хвілін жыцця...

**ХВІЛІНА ДРУГАЯ**

Ён па-ранейшаму стаяў адзін сярод мертвых ворагаў, шырока расставіўшы ногі і крыху падаўшыся ўперад. Ні ценю страху на твары, да якога ніколі-ніколі не дакраналася гарачая дзявочая шчака. Цёллы ветрык абвяваў шыю, якую ніколі не абвівалі пяшчотныя дзявочыя рукі.

Раз-два-тры! Раз-два-тры!

Размераны тупат фашысцкіх ботаў усё бліжэй і бліжэй.

Гэта прыгавор: не бачыць табе, народны мсцівец Леанід Лорчанка, салаўіных начэй, не адчуваць гарачых вуснаў каханай.

І вялікі жаль ахапіў яго. Жаль за тое, што не зможа больш узяць баявую зброю, каб помсціць ворагу. Помсціць за маладосць, абпаленую грымотнымі выбухамі, помсціць за тое, што рана, вельмі рана давялося стаць дарослым.

Што ведаў ён аб жыцці? Што яго трэба пражыць так, каб не было пакутліва балюча за бязмэтна пражытыя гады. І яму стала вельмі шкада, што ён зрабіў так мала за свае семнаццаць.

Што ведаў ён аб смерці? Лёня бачыў кінафільмы, чытаў кнігі, героі якіх гінулі з высокападнятай галавой. І нярэдка ў дзіцячым уяўленні паўставаў малюнак: ён, Леанід Лорчанка, не проста магілёўскі школьнік. Ён – Авадзень. Яму хацелася быць падобным і на Катоўскага, і на Качубея, і на Шчорса.

Але гэта было тады, у шчаслівыя гады дзяцінства. А цяпер – вось яно, суровае выпрабаванне. Ці хопіць мужнасці, ці хопіць адвагі, каб прыняць смерць гэтак жа проста і ў той жа час гераічна, як любімыя героі?

Раз-два-тры! Раз-два-тры!

Толькі злавесны тупат ног парушае чуйную цішыню. У фашыстаў грубая сіла, прага захапіць, знішчыць, зруйнаваць усё, што з маленства дорага сэрцу Лёні.

З Лёнем – любімыя героі. Тыя, на каго ён стараўся быць падобным з першых жа дзён вайны, у каго вучыўся мужнасці і стойкасці. Яны – не проста героі. Яны – сімвал рэвалюцыйнай адданасці партыі і Радзіме, сімвал непераможнасці нашых ідэй. На іх традыцыях выхоўваўся Лёня.

Дзве сілы павінны сутыкнуцца ў жорсткім і бязлітасным баі. Хто пераможа?

**ХВІЛІНА ТРЭЦЯЯ**

Кажуць, што перад смерцю чалавек не можа думаць паслядоўна, лагічна. Кажуць, што перад смерцю думкі ліхаманкава наскокваюць адна на адну, утвараючы суцэльную блытаніну.

Гледзячы ў якога чалавека. Гледзячы якой смерцю памірае чалавек. Гледзячы ў імя чаго ён памірае.

Перад мужнасцю і яснасцю думкі камісараў, што ідуць праз гады па старонках зачытаных кніг, – схіліце галовы!

Вобразы герояў, мільгануўшы аднойчы перад шырока адкрытымі вачыма ужо не пакідалі яго. І, адчуўшы іх нябачную прысутнасць, ён, здаецца, пераняў камісарскую пагарду да смерці, здольнасць прыняць яе мужна і стойка.

Раз-два-тры! Раз-два-тры!

Гэта – яны.

Тады, у сорак першым, яшчэ не ўяўляючы іх, ён ужо быў ахоплены адзіным жаданнем – знішчаць ненавісных вырадкаў.

Бацька... Ён разумеў яго, Лёню. Таму не здзівіўся, сустрэўшы сына ў ваенкамаце.

– Як малады? Ды вы што? А Уладзімір Азін, а Гайдар?

Ваенком, суровы, з сінімі ад бяссонных начэй мяшкамі пад вачыма, быў няўмольны.

Бацька змахнуў слязу с вачэй:

– Бывай, сын!..

І пайшоў туды, адкуль даносіліся артылерыйскія залпы.

Ленінская – ваенкамат. Ваенкамат – Ленінская. Зноў Ленінская – ваенкамат. Ваенком, урэшце здаўся:

– Пазнаю! Сябе пазнаю! Такім жа быў...

І сурова:

– Мацней вінтоўку трымай, салдат!

Моцна трымаў. Запомніў наказ ваенкома. Не выпусціў у час акружэння пад Сухарамі, у трох кіламетрах ад Магілёва. Далей шлях быў адрэзаны. Вярнуўся назад, у Магілёў. Схаваў вінтоўку ў падвал паўразбуранага дома.

Ведаў: спатрэбіцца.

Маці... Старэнькая, увішная, у белай паркалёвай хустачцы.

– Мама, адкуль у цябе іней на скронях? Цяпер жа лета!

Толькі потым зразумеў: гады пасерабрылі галаву маці.

– Сынок! Чаму такі замкнёны? Табе ж сямнаццаць...

Трывожна глядзіць маці – змяніўся сын. Дзе вясёлая ўсмешка, жыццярадаснасць? Стаіўся Лёня. Дадому прыходзіць пад раніцу.

– У бабулі начаваў, – а сам вочы хавае.

Маці ўсё бачыць. Ведае, што робіць сын. Увесь горад гаворыць пра смельчака, які расклейваў лістоўкі. Цімафей Іванавіч Крываносаў перадаў загад Васіля Батуры і Мікалая Харкевіча – чаго б ні каштавала, звязацца з адважным смельчаком:

– Гэта ж знаходка для падполля...

"Знаходкай" аказаўся сын Агаф'і Аляксееўны Лорчанка – Лёня.

Познім вечарам 1941 года члены падпольнай групы, у састаў якой уваходзіла і маці Лёні, прымалі ад новага падпольшчыка клятвуз з ворагам да апошняй кроплі крыві...

**ХВІЛІНА ЧАЦВЁРТАЯ**

Раз-два-тры! Раз-два-тры!

Яны зусім побач. Лёня добра бачыць іх твары, нахабныя, сытыя, укормленыя.

Але чаму яны не страляюць? Чаму працягваюць ісці нага ў нагу, чаканячы крок?

Яны ішлі вось так па вуліцах роднага Магілёва, тады, у сорак другім. Праносіліся грузавікі, набітыя гітлераўскімі салдатамі. І мала хто звяртаў увагу на невялічкага хлопца, які ішоў каля галоўных магістралей.

І калі хлопец знікаў з шашы, на ёй тварылася нешта незразумелае. У паветры гучалі праклёны і брыдкая лаянка. Спынялі свой імклівы бег грузавікі, і сціснутае паветра са свістам выходзіла з гумавых колаў.

Вострыя іголкі "яршоў" рабілі сваю справу – ніякая, нават звышгатунковая, гума не вытрымлівала – "яршы" ўсё роўна прабівалі пакрышкі.

А назаўтра хлопца можна было бачыць на другім канцы горада.

– Запалкі! Каму патрэбны запалкі! – звонкі хлапечы голас разносіўся па гарадскім рынку.

На крык збягаліся людзі. У сорак другім запалкі былі дэфіцытам. Пакупнікі не крыўдзіліся, калі ў карабку не хапала дзесятка запалак, затое там знаходзілі лістоўкі са зводкамі Саўінфармбюро.

Знайшоўся мярзотнік – данёс, што чалавек, які гандлюе запалкамі, распаўсюджвае бальшавіцкія лістоўкі. За таямнічым гандляром пачалі сачыць. І высачылі аднойчы. І быў аддадзены загад зрабіць аблаву. І знайшлі ўжо некалькі карабкоў запалак з лістоўкамі. Але прадаваў іх... фашысцкі паслугач, здраднік Жбан, які адкрыў на рынку свой ларок для гандлю нарабаванымі рэчамі. Адчуўшы небяспеку, Лёня Лорчанка оптам прадаў яму ўсю партыю дэфіцытных запалак.

Здрадніка Жбана павесілі самі фашысты. О, як Лёня тады радаваўся!

А потым... Потым ён ішоў з павязкай паліцэйскага па вуліцах роднага горада і нёс запаветную вінтоўку з падвала. Яна спатрэбіцца там, у атрадзе Белавусава. Інакш немагчыма было вынесці зброю з горада. А без яе – ён ведаў – у баявую групу не прымць.

Камісар атрада. Іван Паўлавіч Станкевіч першым сустрэў Лёню. Моцна пацiснуў руку:

– Дзякую за службу.

Камісар меў цвёрды позірк, жалезны характар і быў адважным чалавекам. Лёня хацеў быць падобным на жалезнага камісара.

Раз-два-тры! Раз-два-тры!

Тупат фашысцкіх ботаў сцішыўся. Цяпер гітлераўцы ў некалькіх кроках.

– Партызан, здавайся!

**ХВІЛІНА ПЯТАЯ**

Здрадзіць? Здрадзіць жалезнаму камісару Станкевічу, здрадзіць бацьку і маці, здрадзіць тром баявым таварышам, што нерухома ляжаць ля суседніх кустоў?

Не, ён не мог нават дапусціць такой думкі.

Іх, чацвёрку самых адданых, самых мужных і загартаваных, паслаў на баявое заданне сам камісар. Заданне было не з лёгкіх. Камісар так і сказаў:

– Магчыма, яго давядзецца выканаць цаною ўласнага жыцця. Калі хто не можа – заставайцеся тут.

Яны, як і астатнія партызаны, былі знясілены пяцідзённымі жорсткімі баямі з насядаючымі карнымі атрадамі. Яны, як і астатнія партызаны, галодныя, з упалымі шчокамі, вынеслі ўсе цяжкасці

пяцідзённай блакады і марылі аб адным – крыху адпачыць, на гадзіну-другую заплюшчыць вочы.

Але ніхто з чацвёркі не выйшаў са строю.

Так, развітаўшыся з марай аб адпачынку, знясіленыя і стомленыя, яны пайшлі на баявое заданне і занялі абарону ля брода цераз раку Вабіч. Фашысты маглі з'явіцца толькі з гэтага боку. Як толькі ланцугі ворага з'явяцца на супрацьлеглым беразе ракі, Лорчанка і яго сябры павінны даць сігнал – вінтовачны выстрал і папярэдзіць аб падыходзе ворага.

Лорчанка першым заўважыў фашыстаў і даў умоўны сігнал. Але самім адступаць было позна – фашысты паспелі акружыць чацвёрку смельчакоў.

Яны адстрэльваліся да апошняга патрона. Калі патроны скончыліся, пусцілі ў ход гранаты. Трое з чацвёркі назаўсёды засталіся ляжаць на полі бою. Яны выканалі сваю партызанскую клятву да канца.

– Рус, здавайся!

Яны хочуць узяць яго жывым. Яго, Лёню Лорчанку?!

Ён высока падняў галаву і ў апошні раз паглядзеў на яркае сонца. Затым, моцна сціснуўшы ў правай руцэ апошнюю гранату, кінуўся ў натоўп гітлераўскіх салдат.

Пачуўся аглушальны выбух...

Развеяўся дым... На зямлі застаўся ляжаць Лёня і дзясятак мёртвых ворагаў.

***

Сёння на Ленінскай вуліцы ў Магілёве – яркае сонца. Яно нібы ўвабрала ў сябе прагу да жыцця, якая хавалася ў апошнім позірку Лёні. Таму і дорыць так шчодра праменні свае.

**Зяньковіч, М. Пяць хвілін перад бяссмерцем / М. Зяньковіч // Чырвоная змена. — 1965. — 6 кастрычніка. — С. 3.**